PolotskSU



**УДК 821.161.3.0.(043) + 141.32**

# ТВОРЧАСЦЬ ЯК ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНЫ МОДУС БЫЦЦЯ Ў РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА «НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ»

***Ю.А. КАЛАМІЙЦАВА***
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)***

*Асэнсаванне ролі творчасці і мастацтва ў жыцці чалавека з'явілася значнай часткай філасофскіх разважанняў на працягу многіх стагоддзяў. Выключэннем не з'яўляецца і філасофія экзістэнцыялізма. Экзістэнцыялісты паставілі творчасць у аснову сваёй філасофіі. У працах Жан-Поля Сартра, Альбера Камю і Мікалая Бярдзяева гэты модус з'яўляецца асновапалагаючым у чалавечым існаванні. Ён непарыўна звязаны з іншымі модусамі, такімі як смерць, каханне, жарсць і роспач. Творчая спадчына Уладзіміра Караткевіча разглядаецца намі як экзістэнцыяльна накіраваная і ставіцца побач з мастацкімі творамі экзістэнцыяльных філосафаў.*

*Праводзіца параўнальны аналіз рамана Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць» і літаратурна-філасофскай спадчыны экзістэнцыяльных аўтараў Жан-Поля Сартра, Альбера Камю і Мікалая Бярдзяева з мэтай абгрунтаваць экзістэнцыяльную накіраванасць ідэй У. Караткевіча.*

**Уводзіны.** Адным са значных састаўляючых філасофіі экзістэнцыялізма з'явілася асэнсаванне модусаў быцця як часткі чалавечага існавання. Гэта такія модусы, як смерць, жах, роспач, адзінота, каханне, творчасць, надзея, якія прасочваюцца як у атэістычнай, так і ў рэлігійнай версіі экзістэнцыяльнай філасофіі. Праблема творчасці мае выключнае значэнне, бо творчасць з'яўляецца непаўторнай, глыбока індывідуальнай, нават больш, глыбока інтымнай напоўненасцю, на якаю заўсёды была скіравана экзістэнцыяльная філасофія. Мастацтва разглядаецца экзістэнцыялістамі ў дадзеным выпадку як значны складальнік творчай дзейнасці суб'екта і як вынік гэтай дзейнасці. Ролю мастацтва падкрэсліваў у сваёй філасофіі яшчэ Ф. Ніцшэ, калі сцвярджаў, што мастацтва дадзена чалавецтву, каб яго не забіла ісціна.

Асаблівае месца ў асэнсаванні творчасці належыць французскім экзістэнцыялістам Альберу Камю і Жан-Полю Сартру. Яны разглядаюць творчасць як спосаб самавызначэння чалавека. Рускі экзістэнцыяльны філосаф Мікалай Бярдзяеў у сваёй працы «Сэнс творчасці» аналізуе значэнне творчага пачатку як антрападыцэі – апраўдання чалавечага быцця ў творчасці і праз творчасць. У беларускай літаратурнай спадчыне таксама прасочваецца спроба філасофскага асэнсавання дадзенага модуса. Асаблівае месца тут займае раман Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць». Ён мае некалькі сюжэтных ліній, якія ў сукупнасці сваёй скіраваны на філасофскае асэнсаванне быцця чалавека і яго творчай рэалізацыі. Як вынік гэтага, мы звяртаем увагу на творчасць У. Караткевіча. Перагляд яго спадчыны дае падставу для пераасэнсавання яго творчасці і вылучэння яго філасофскай пазіцыі як экзістэнцыяльнай.

Мэта дадзенай працы – на аснове параўнальнага аналізу філасофскіх і мастацкіх твораў экзістэнцыяльных аўтараў і рамана У. Караткевіча «Нельга забыць» абгрунтаваць экзістэнцыяльны характар ідэй У. Караткевіча і падкрэсліць значнасць творчасці як модуса быцця ў экзістэнцыяльнай філасофіі.

**Асноўная частка.** Галоўным героем апавядання з'яўляецца паэт Андрэй Грынкевіч. Андрэй знаходзіцца ў так званай сумежнай сітуацыі. Яго каханая Алёна гіне ў аварыі незадоўга да шлюбу і ён пасля гэтага губляе сэнс жыцця. Ужо прайшло дзесяць год з моманту трагедыі, але ён не можа на гэта забыцца. «З чужога погляду ён жыў гэтыя дзесяць год жыццём звычайнага чалавека. Вучыўся, скончыў універсітэт, працаваў, пісаў вершы, дабіўся некаторых поспехаў – толькі знаёмыя, блізкія сябры маглі бачыць, што вочы яго часам робяцца пустыя, і ўсё расце і расце ў іх тая пустэча і незадаволенасць сабой» [1, с. 71]. Ён задумваецца: «А каб я ведаў, куды мне ісці, хто я, на што здатны – гэтага няма. І невядома, калі будзе» [1, с. 64]. Адзінае, што яго ратуе – гэта праца, напісанне вершаў. Аднак ён адчувае, што «вось ужо два гады ён піша горш. Два гады, якраз з таго часу, калі пачаў радзей успамінаць аб Алёнцы» [1, с. 72]. Загублены сэнс жыцця прыводзіць Грынкевіча да думкі, што дрозд на галіне шчаслівейшы за чалавека, хоць не ведае ні працы, ні думак, ні пазнання. Ён жыве і працуе з аднолькавай абыякавасцю да тых, з кім знаходзіцца побач. Ён разумее гэтае сваё становішча, разумее, што не ведае што і як пісаць. Такі сумежны стан у Андрэя звязаны таксама з перажываннем творчага крызісу. Грынкевіч тлумачыць Ірыне Горавай: «Разумееце, у кожнага бываюць свае сполахі. І часам прыходзіць хвіліна, калі здаецца, што ты нічога больш не можаш, што хоць пяро з'еш, атрымаецца лухта… І гэта, сапраўды, пасля вялікіх страт» [1, с. 98]. Караткевіч звяртае ўвагу на тое, што творчасць – гэта складаны працэс. Яно, як само жыццё, і з'яўляецца яго часткай. Творчасць заўсёды трагічная. Нельга тварыць, быўшы шчаслівым. Праз разважанні героя

PolotskSU



Караткевіч сцвярджае думку, што вершы, якія патыхаюць нейкай чыстай яснасцю і халаднаватасцю – гэта смерць для паэта. Абсурд у Караткевіча заключаецца ў тым, што для атрымання свабоды, для пераадолення абсурднасці жыцця чалавеку патрэбна творча рэалізавацца. Творчасць – гэта і ёсць свабода, але творчасць – гэта яшчэ і абсурд. Для творчай рэалізацыі неабходны пакуты і адзінота. Сапраўдная творчасць немагчыма ў шчаслівым стане.

У сваім светаўспрыманні герой твора вельмі блізкі да Антуана Ракантэна – героя рамана Сартра «Млосць». Ракантэн піша навуковую працу пра маркіза дэ Ральбона, але яго становішча таксама патыхае безвыходнасцю і пустэчай: «Мая жарсць памерла. Яна напаўняла мяне і дурыла шмат гадоў запар і зараз я быў спустошаны. Але гэта было яшчэ не самае горшае: перада мною раскінуўшыся з гэткай нядбайнасцю, мітусілася нейкая думка – вялізная і цьмяная. Цяжка сказаць, у чым быў яе змест, але я не мог на яе глядзець, так яна была мне агідна» [2, с. 10]. Млосць Ракантэна і стан Грынкевіча маюць адзіную сутнасць – гэта згублены сэнс жыцця, які вельмі характэрны для экзістэнцыяльнага суб’екта. Усведамленне абсурднасці быцця блакіруе волю. Немагчыма працаваць, калі ў сваёй працы ўжо не бачыш сэнсу. «Што»? пісаць і «Як»? пісаць – гэтыя два асноўныя пытанні суправаджаюць герояў рамана Сартра і Караткевіча ўвесь час. У творчасці, як і ў жыцці, пануе абсурд. Ракантэн зазначае: «Я добра ведаю, што нічога не хачу рабіць: рабіць што-небудзь – значыцца тварыць быццё, а яго і без гэтага зашмат» [2, с. 309].

Погляды У. Караткевіча рэзаніруюць з ідэяй А. Камю, якая звязана з творчым працэсам. А. Камю сцвярджае думку, што мастацтва было б немагчыма, калі б свет быў празрыстым. Творчасць, як і жыццё, з’яўляецца параджэннем абсурду.

Творчасць абсурду – гэта таксама тэматыка твора А. Камю «Міф пра Сізіфа». Ён сцвярджае, што роля мастацкіх твораў заключаецца ў адлюстраванні жыццёвага вопыта, які нясе на сябе адбітак смерці. «Мастацкі твор… абсурдны сам па сабе, і магчыма апісваць толькі той мастацкі твор, які не можа прапанаваць выйсця пакутам нашай свядомасці. Наадварот, гэта адзін з сімвалаў пакут, якія адлюстроўваюцца з яго ўдзелам у кожнай чалавечай думцы» [3, с. 102]. На думку А. Камю, сэнс мастацкага твора ў тым, што ён выводзіць разум чалавека за яго межы і звяртае яго да другога, каб паказаць тупік, да якога набліжаецца чалавецтва.

У. Караткевіч сцвярджае значнасць мастацтва ў сітуацыі абсурду і роспачы праз словы выкладчыцы мастацтва Ірыны Горавай. Калі яна чытае лекцыю пра Рэмбранта, яна гаворыць: «А Рэмбрант добра ведаў цану чалавека, нават у безвыходным адчаі. Ён ведаў: дрэнных няма. І адзінае, што можа ўзняць чалавека, які апусціўся, – гэта мастацтва. Мастацтвам гуляць нельга. Гэта не заказ і не гульня ў бірулькі, гэта сумленне зямлі» [1, с. 97].

Творчасць непарыўна звязана з такімі модусамі быцця, як смерць, каханне, адчай. Жах перад смерцю і асэнсаванне свайго быцця, як «быцця-да-смерці» штурхае экзістэнцыяльнага суб’екта да пошукаў выйсця з абсурднай сітуацыі і жаданне атрымаць бессмяротнасць. Дасягнуць бессмяротнасці магчыма толькі з дапамогай мастацтва. Гэта думка аднолькава праходзіць праз творы Сартра, Бярдзяева, Камю і Караткевіча. Творчасць не толькі раўназначна быццю і каханню, але і супрацьстаіць смерці. Каханне таксама з’яўляецца творчым актам.

М. Бярдзяеў зазначае, што каханне з’яўляецца творчай дзёрзкасцю. «Каханне – акт творчы, які стварае іншае жыццё, які можа перамагчы «свет», які перамагае род і прыродную неабходнасць. У каханні сцвярджаецца асоба, адзіная, непаўторная» [4, с. 135].

Караткевіч таксама ставіць каханне ў аснову быцця і творчасаці. Каханне «ўсё дае: кнігі, музыку, гераізм… Гэта яшчэ і бяссонныя ночы, калі хварэе, і чаркі, якія выпіў, блукаючы вакол радзільнага дома, і мастацтва, і музыка ў доме, і нават смерць» [1, с. 274]. Праз разважанні Андрэя і яго сябра Яніса Караткевіч таксама выводзіць спецыфічную філасофію творчасці і смерці. Смерць – «гэта брыдка, гэта агідна, гэта супраць усяго добрага на зямлі: працы, вершаў, кахання, музыкі… І так несвоечасова… Думаць, што мы паміраем, таму што смяротныя, – папоўшчына, лухта… Мы ўсе разам з сэрцам, разам з вачыма і слыхам – мы варожыя смерці. Мы ўсе для жыцця, мы ўсе, каб ламаць смерці хрыбет. Што, можа скажаш, што матэрыя створана для смерці?… Нас забівае жыццё, подласць моцных, вайна. Але калі-небудзь мы ўстанем… І тады божаму наканаванню смерці прыйдзе канец» [1, с. 134 – 135]. Смерць у Караткевіча раўнаважна абсурду і не мае аніякага сэнсу. Толькі ў творчасці і каханні, на думку аўтара, існуе сэнс быцця: «Забыцця ў каханні і смерць не дае…» [1, с. 172]. Для таго каб перамагчы смерць, ёсць толькі адзіны шлях: «Жыць кожную секунду. Думаць, рухацца, рабіць кожную хвіліну. Тады, напэўна за семдзесят год пражывеш не менш за дрэва, якое трыста год стаіць на месцы… Варта паспрабаваць ва ўсякім разе… І яшчэ кахаць. Той хто кахае – бессмяротны. Ён кожную хвіліну перажывае стагоддзе. І ён вораг смерці» [1, с. 135]. Толькі творчасць і каханне могуць перамагчы смерць. Чалавек «не звер на зямлі», калі можа рабіць вялікія творы.

PolotskSU



Яшчэ адно разважанне наконт творчасці закранае пытанне станаўлення чалавека як непаўторнай асобы – яго «сябетворчасць». Усведамленне свядомасцю самаго сябе Караткевіч выказвае праз думку, што ў чалавека ёсць толькі адзіны жорсткі суд – гэта суд над сабою. Чалавек сам вырашае, якім яму быць, сам ацэньвае свае ўчынкі. Караткевіч тут вельмі сугучны з Сартрам. Сартр акцэнтуе ўвагу на тым, што чалавек ёсць тое, што ён сам з сябе робіць. Гэта першапрынцып экзістэнцыялізма, які Сартр і называе суб’ектыўнасцю. Гэта таксама творчасць. Чалавек – гэта перш наперш праект, які перажываецца суб’ектыўна. Чалавек сам сябе стварыў і адказвае за ўсё, што робіць. На думку экзістэнцыялістаў, «…няма ніякага кахання, акрамя таго, што стварае само сябе; няма ніякага «магчымага» кахання, акрамя таго, якое ў каханні праяўляецца. Няма ніякага генія, акрамя таго, што выражае сябе ў мастацкіх творах. Геній Пруста – гэта творы Пруста. Геній Расіна – гэта шэраг яго трагедый, акрамя іх нічога няма» [5, с. 333]. Сартр параўноўвае мастацтва і жыццё. Ён сцвярджае, што экзістэнцыяльны, маральны, выбар можна параўнаць са стварэннем мастацкага твора. Мастак жыве стварэннем свайго твора, і карціна, якая павінна быць намалявана, – тая, якую её намалюе. «Ніхто не можа сказаць, якім будзе жывапіс заўтра. Аб карцінах можна разважаць толькі тады, калі яны ўжо намаляваны. Якія адносіны да гэтага мае мараль? Тут мы таксама аказваемся ў сітуацыі творчасці. Мы ніколі не гаворым пра самавольнасць мастацкага твора. Абмяркоўваючы палатно Пікассо, мы не гаворым, што яно самавольна. Мы добра разумеем, што малюючы, ён стварае сябе такім, які ён ёсць, што сукупнасць яго твораў уключаецца ў яго жыццё» [5, с. 339]. Сартр таксама звязвае пытанне мастацкай творчасці са свабодай. Свабода, па Сартру, адчуваецца не ў суб’ектыўным дзеянні, а ў творчым акце, які вызваны імператывам. Бердзяеў свабодным мастацтвам называе каханне. І сцвярджае, што гэтая свабода купляецца толькі ахвяраю. Караткевіч свабоду бачыць у тым, каб «выказваць, выяўляць сябе. І нават пакуты і радасці людзей перажыць праз сябе. *Каб быў Я выяўлены*» (курсіў мой – *Ю. К.*) [1, с. 148]. Выяўленне свайго Я і надае кожнаму чалавеку сэнс існавання. Сартр тую ж самую ідэю сцвярджае праз адкрыццё Ракантэнам сэнсу ў напісанні рамана. Герой разумее, што толькі праз творчыя пакуты, чалавек набывае сэнс. Ракантэн разважае: «Я таксама жадаў *быць*. Уласна кажучы, нічога іншага я не жадаў – вось яна разгадка майго жыцця… «Ці змагу я паспрабаваць? … Гэта была б кніга – нічога іншага я не ўмею… Кнігу. Раман. І знойдуцца людзі, якія яго прачытаюць і скажуць: «Яго напісаў Антуан Ракантэн…» [2, с. 317]. Чаму менавіта раман? Магчыма адказаць на гэтае пытанне, калі прыгадаць словы А. Камю ў яго працы «Міф пра Сізіфа»: «Раман – гэта метад пазнання, глыбокага і бязмежнага, падобнага на каханне. Напісанне раманаў і каханне радняць сапраўднае захапленне і разважанне, якія прыносяць багатыя і яскравыя вынікі» [3, с. 108]. Захапленне экзістэнцыялістамі мастацкай творчасцю непарыўна звязана з перажываннем быцця, сумежнымі сітуацыямі, ярка выражанай эмацыянальнасцю, якое дапамагае пазнаваць экзістэнцыяльнаму суб’екту навакольны свет. Выражэнне эмоцый і перажыванняў у мастацкай літаратуры нагадвае сабою рэфлексію суб’екта над самім сабою.

Сумежная сітуацыя, якая часцей за ўсё сустракаецца ў экзістэнцыялізме, – гэта жах смерці альбо перажыванне смерці блізкага чалавека. Калі памірае Ірына Горава, самы дарагі для Андрэя чалавек, ён разумее, што адзінае, чым ён можа вярнуць ёй жыццё, зберагчы іх каханне, – гэта яго творчасць. Горава, ведаючы, што ёй няшмат засталося жыць, неяк сказала на лекцыі словы адной каханай мастаком дзяўчыны: «І дам табе бязмернае шчасце, а ты мне за гэта бяссмерце» [1, с. 255]. І герой вырашае, што толькі сваімі вершамі, сваёй памяццю аб ёй, ён верне яе да жыцця. «Гэты шлях толькі пачынаўся. На ім не было радасці. Была толькі праца, вайна, радкі… якім не было звароту да ранейшага. Але на ім не было і хлусні, і абыякавасці, і боязі. Баяцца больш не было чаго» [1, с. 335]. Грынкевіч з’яўляецца своеасаблівым Сізіфам. Караткевіч гаворыць, што магчыма «не мае права на шчасце чалавек, якога чакае вечны бой» [1, с. 330]. Але, кажучы словамі Камю: «Дастаткова адной барацьбы за вяршыню, каб чалавечае сэрца напоўнілася сэнсам» [3, с. 128]. Герой знаходзіць гэты сэнс ў творчасці. Невыпадкова Караткевіч напрыканцы рамана «забівае» сваю гераіню. Шчаслівае каханне Андрэя і Ірыны знішчыла б яго талент, ён бы не змог працаваць, і толькі пакуты, адчай і ўсведамленне страты і смяротнасці штурхае яго да пераасэнсавання жыцця, да жадання пісаць, бо сапраўдная творчасць патрабуе ахвяры. Каханне таксама творчасць. Трагізм творчасці заключаецца ў тым, што зараджаецца яно на глебе кахання, але квітнее толькі на яго магілках. Бярдзяеў слушна зазначае, што каханнне таксама трагічна. «І самае вялікае ў каханні тое, што зберагае яго патаемную святасць, гэта адмаўленне ад усялякіх жыццёвых перспектыў, ахвяра жыццём. Гэтай ахвяры патрабуе ўсялякая творчасць, патрабуе ахвяры і творчае каханне. Жыццёвая ўпарадкаванасць, сямейная ўпарадкаванасць – могілкі кахання. Ахвярная пагібель у жыцці і накладае на каханне пячатку вечнасці. Каханне больш цесна, больш інтымна і больш глыбока звязана са смерцю, чым з нараджэннем, і гэта сувязь, якая ўгадваецца паэтамі кахання, залог яе вечнасці» [4, с. 135]. Для атры-мання сапраўднай свабоды ў творчасці герою неабходна вызваліцца ад апошняй сувязі, апошняй за-

PolotskSU



лежнасці – сувязі любоўнай. Ад гэтай сувязі пазбаўляецца і герой Сартра Ракантэн, калі ў яго адбываецца апошняя размова з яго каханай Ані. Ані і Антуан робяцца чужынцамі і Ані ад'язджае з іншым. Ірына Горава памірае, не вытрымаўшы складанай аперацыі. Набыццё адзіноты сімвалізуе панаванне абсурду з якога нараджаецца творчасць і свабода. Караткевіч ў роўнай ступені, як і іншыя экзістэнцыялісты, сцвярджае думку, што існуе адзіная аснова, якая існуе ў адносінах паміж людзьмі. І гэта аснова – мастацтва. Калі адзінота і абсурд дасягаюць вышэйшага накалу, калі свабоднае ўсведамленне адчувае сваю неапраўданасць, толькі тады чалавек уздымаецца над быццём і смерцю.

**Заключэнне.** Такім чынам, на падставе філасофска-культуралагічнага аналізу рамана У. Караткевіча і тэкстаў экзістэнцыяльных аўтараў можна слушна зазначыць, што творчасць у экзістэнцыяльнай філасофіі з'яўляецца асноўным модусам чалавечага быцця, які непарыўна звязаны з іншымі экзістэнцыяльнымі модусамі: каханнем, смерцю, адчаем і з'яўляецца таксама выражэннем чалавечай свабоды. Адзінае, што можа выратаваць чалавека ў абсурднасці быцця, на думку экзістэнцыяльных аўтараў, – гэта мастацтва і творчасць.

На падставе параўнальнага аналізу нават толькі аднаго твора У. Караткевіча з творамі экзістэнцыяльных аўтараў можна ўбачыць яскравы рэзананс думак і ідэй гэтых аўтараў і вылучыць некалькі відаў творчасці:

- творчасць як працэс рэалізацыі сябе праз мастацкія творы;
- каханне як творчы працэс;
- творчасць у сэнсе станаўлення суб'екта як асобы;
- творчасць як выражэнне свабоды суб'екта.

Такім чынам, можна з упэўненнасцю сцвярджаць, што раман Уладзіміра Караткевіча сугучны экзістэнцыяльнай філасофіі, мае ярка выражаную экзістэнцыяльную накіраванасць і можа быць аднесены да твораў беларускай літаратуры з ярка выражанай экзістэнцыяльнай праблематыкай.

ЛІТАРАТУРА

1. Караткевіч, У. Нельга забыць // Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1988. – Т. 3: Раман. Аповесці. – 543 с.
2. Сартр, Ж.-П. Тошнота: роман / Ж.-П. Сартр. – М.: Фолио, 2004. – 317с.
3. Камю, А. Миф о Сизифе; Бунтарь / А. Камю – Минск: Поппури, 1998. – 544 с.
4. Бердяев, Н. Смысл творчества // Эрос и личность: философия пола и любви / Н. Бердяев. – СПб., 2007. – 224 с.
5. Сартр, Ж.-П. Экзистенциализм – это гуманизм // Сумерки богов / Ж.-П. Сартр. – М: Политиздат, 1989. – 398 с.

*Паступіў 14.04.2008*